Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 ВЕРАСНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 171 (28029) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Уласнікі жылля змагаюцца за кватарантаў

СТАР. 6



Беларускі Версаль у Шчучыне

СТАР. 8



У космасе навядуць чысціню

СТАР. 12

■ Свята

# ЗАЧАРАВАННЕ СЛОВАМ



Фота Надзеі БУЖАН.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.



**Першую Нацыянальную літаратурную прэмію лаўрэатам уручалі міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ і старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ.**

**Свята беларускага пісьменства ў Шчучыне прайшло на найвышэйшым узроўні. Падавалася, цэлы горад выйшаў на вуліцы, каб далучыцца да ўрачыстасцей. Яблыку не было дзе ўпасці не толькі на пешаходных вуліцах і за столікамі, але і каля стэндаў выдавецтваў, сярод шэрагаў рамеснікаў. Паказаць сябе прыязджалі таксама і суседзі — навагрудчане, іўеўцы, лідчане і многія іншыя. І ніхто не спаборнічаў паміж сабой — усе супольна імкнуліся паказаць, на што здольна Гродзеншчына. Натуральна, сюды завітала шмат майстроў слова, якіх можна было сустрэць літаральна на кожным перакрыжаванні слаўнага горада. І ўпершыню былі падведзены вынікі новай Нацыянальнай літаратурнай прэміі.**

СТАР. 4




## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Мову, культуру, пісьменства можна назваць ахоўнай граматай беларускай дзяржаўнасці. Гэта фундамент, на якім грунтуецца развіццё нашага грамадства. Наш святы абавязак — захаваць яго і прымножыць».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 13° |
| Віцебск | + 14° |
| Гомель | + 14° |
| Гродна | + 14° |
| Магілёў | + 14° |
| Мінск | + 15° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.09.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17791,00 | ▲ |
| Еўра | 19825,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 259,71 | ▼ |
| Укр. грыўня | 808,68 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Надвор'е

## УНАЧЫ ХОЛАДНА, А РАНІЦАЙ ТУМАН

**Тэмпературны фон на гэтым тыдні чакаецца на 1-3 градусы ніжэйшы за норму, а на выхадныя прагназуюцца першыя замаразкі.**

Сапраўды восеньскае няўстойлівае надвор'е чакаецца ў нашай краіне ў найбліжэйшыя дні, пра што паведаміў **начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Дзмітрый РАБАЎ**.

Прагназуецца, што ў першай палове тыдня характар надвор'я будуць вызначаць атмасферныя франты і халодная паветраная маса, якая паступае да нас з боку Балтыйскага мора. У аўторак на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, удзень у асобных раёнах магчымы навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 12-18 градусаў. Амаль паўсюдна чакаюцца кароткачасовыя дажджы і ў сераду. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ўначы знізіцца да 4-9 цяпла, толькі месцамі будзе да 11, а ўдзень чакаецца плюс 12-17 градусаў.

Пачынаючы з чацвярга, атмасферны ціск пачне расці, і зона высокага атмасфернага ціску ў большасці раёнаў разбурыць дажджавыя хмары. У такой сітуацыі ўначы стане яшчэ халадней, а вось удзень, наадварот, крыху пацяплее. Таму ў чацвер толькі месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ізноў уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 4-9 цяпла, удзень — плюс 13-18 градусаў. У пятніцу ў асобных раёнах прагназуюцца невялікія кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі слабы туман. Увага! Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 3-10 градусаў, аднак па поўначы ў асобных раёнах на глебе магчымы ўжо першыя слабыя вераснёўскія замаразкі ад 0 да мінус 2 градусаў. Удзень стане значна камфортней, калі сонейка прагрэе паветра да плюс 14-21 градуса.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў, на выхадныя наша краіна застанецца ў вобласці высокага атмасфернага ціску. Таму будзе больш сонца, пераважна без ападкаў, толькі па поўдні магчымы кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай ужо традыцыйна месцамі туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 3-10 градусаў, у суботу па поўначы ў асобных раёнах на глебе магчымы слабыя замаразкі да мінус 2. Удзень будзе плюс 12-18 градусаў, а месцамі нават да 20 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

# НА ТРЫВАЛЫМ ФУНДАМЕНЦЕ

## Беларусь і Індыя маюць намер актыўна і ў поўнай меры выконваць дасягнутыя на найвышэйшым узроўні дамоўленасці

**Аб іх рэалізацыі ішла размова падчас сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з міністрам гандлю і прамысловасці Індыі Нірмалай Сітхараман і Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Індыі ў Беларусі Маноджам Кумарам Бхарці, які завяршае сваю дыпламатычную місію ў Мінску, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.**

Вітаючы Нірмалу Сітхараман, Аляксандр Лукашэнка падзякаваў ёй за візіт і падкрэсліў, што гэта вельмі важная сустрэча пасля перамоў на найвышэйшым узроўні з Прэзідэнтам Індыі, які наведаў нашу краіну ў чэрвені гэтага года. Беларускі лідар высока ацаніў узровень узаемаадносін з Індыяй увогуле і вынікі перамоў з кіраўніком індыйскай дзяржавы ў прыватнасці. «Мы добра правялі перамовы і пра многае дамовіліся. Думаю, што ваш візіт будзе каштоўны тым, што мы пачнём рэалізоўваць гэтыя дамоўленасці на практыцы», — сказаў ён. Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі няма закрытых тэм у супрацоўніцтве з Індыяй. «Нішто не перашкаджае нам узаемадзейнічаць па любым кірунку», — дадаў ён.

«Падмуркам любых адносін з'яўляюцца гандаль і эканоміка, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Гандлёва-эканамічныя сувязі — гэта аснова нашых узаемаадносін, і наколькі актыўна будуць узаемадзейнічаць ключавыя міністэрствы Беларусі і Індыі, настолькі паспяховымі будуць двухбаковыя адносіны па ўсіх напрамках».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што Нірмала Сітхараман падчас свайго візіту ў Мінск можа азнаёміцца з магчымасцямі Беларусі ў розных сферах. «І калі ў вас будзе цікавасць да нейкай тэмы, мы гатовы з вамі супрацоўнічаць для рэалізацыі таго ці іншага праекта», — запэўніў Прэзідэнт.

Нірмала Сітхараман нагадала, што падчас візіту на найвышэйшым узроўні Індыя вылучыла крэдытную лінію на $100 млн. «Мы спадзяёмся, што зможам знайсці праекты ў сферах агульных інтарэсаў, якія пасля будуць рэалізаваны з выкарыстаннем гэтай крэдытнай лініі», — сказала яна, таксама падкрэсліўшы важнасць супрацоўніцтва з Беларуссю ў ЕАЭС, якое лічыць вельмі перспектыўным.

Падчас сустрэчы была закранута тэма гандлёва-эканамічных адносін. Прэзідэнт Беларусі лічыць недастатковым сённяшні ўзровень беларуска-індыйскага тавараабароту. У мінулым годзе гэты паказчык складаў крыху больш за $400 млн, а за студзень-ліпень гэтага года — звыш $300 млн. І хоць маецца дынаміка росту, па ўзаемным меркаванні беларускага і індыйскага бакоў, ёсць патэнцыял для істотнага пашырэння двухбаковага тавараабароту. Таму гаворка ішла аб канкрэтных вектарах далейшага, больш актыўнага ўзаемадзеяння паміж дзвюма краінамі, у тым ліку ў сферах прамысловасці, машынабудавання, фармацэўтыкі, калійнай галіны, ІТ-тэхналогій, а таксама адукацыі.

У прыватнасці, беларускі бок разглядае магчымасць стварэння ў Індыі буйнога прамысловага цэнтра, дзе будуць наладжаны вытворчасць, рэалізацыя і сэрвіснае абслугоўванне нашай тэхнікі. У праекце плануецца задзейнічаць БелАЗ, МТЗ, МАЗ і іншыя буйныя беларускія прадпрыемствы, прадукцыя якіх будзе рэалізоўвацца ў Індыі. Індыйскі бок зацікавіўся гэтай ідэяй і выказаў гатоўнасць прыкласці максімум намаганняў для яе рэалізацыі.

Прэзідэнт Беларусі запрасіў індыйскія фармацэўтычныя кампаніі больш актыўна прыходзіць на беларускі рынак, у тым ліку з перспектывай рэалізоўваць прадукцыю ў краінах ЕАЭС.

Была закранута таксама тэма супрацоўніцтва ў калійнай сферы. Нірмала Сітхараман сказала пра гатоўнасць індыйскіх кампаній не толькі купляць калійныя ўгнаенні, але і аб жаданні інвеставаць у беларускую калійную галіну.

Індыйскі бок выказаў зацікаўленасць у тым, каб больш студэнтаў з Індыі вучылася ў Беларусі. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што Беларусь гатова прыняць усіх ахвотных атрымліваць адукацыю ў нашай краіне.

Акрамя таго, Прэзідэнт Беларусі выказаў словы падзякі ў адрас Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Індыі Маноджа Кумара Бхарці ў сувязі з завяршэннем яго дыпламатычнай місіі ў Беларусі. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што дыпламат многае зрабіў для ўмацавання беларуска-індыйскага супрацоўніцтва.

■ Выбары-2015

# РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ:

## у Цэнтральную камісію паступіла шэсць пакетаў дакументаў

**Учора стала вядома, што дакументы для рэгістрацыі кандыдатам на пост Прэзідэнта ў Цэнтральную камісію па выбарах і правядзенні дзяржаўных рэферэндумаў прадаставілі ажно шэсць прэтэндэнтаў. Акрамя тых, хто набраў дастатковую колькасць подпісаў, — Аляксандр Лукашэнка, Сяргей Гайдукевіч, Мікалай Улаховіч і Таццяна Караткевіч, дакументы прадставілі Віктар Цярэшчанка і Жанна Раманоўская.**

Нагадаем, на мінулым тыдні Цэнтральная камісія апублікавала папярэднюю інфармацыю па выніках праверкі падпісных лістоў. Згодна з імі, у падтрымку прэтэндэнта на пасаду Прэзідэнта Віктара Цярэшчанкі, ініцыятыўная група якога першапачаткова здала звыш 130 тысяч подпісаў, улічана менш чым сем тысяч подпісаў. Як паведамлялася, менавіта столькі з іх прызнана сапраўднымі ў выніку спецыяльнай працэдуры праверкі — калі пасля перавышэння пэўнага працэнтнага парога несапраўдных аўтографаў усе подпісы, сабраныя па дадзеным рэгіёне, не ўлічваюцца.

У той жа час ад Жанны Раманоўскай для праверкі паступіла ўсяго 780 подпісаў, якіх недастаткова для рэгістрацыі кандыдатам.

Наступным этапам выбарчай кампаніі стане рэгістрацыя кандыдатаў на найвышэйшую дзяржаўную пасаду — ЦВК правядзе яе 10 верасня, а ўжо 11 верасня пачнецца этап перадвыбарнай агітацыі і прапаганды.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■

# СТАРАДАЎНІ БЕЛАРУСКІ ВАЕННЫ СЦЯГ

## праз сто гадоў вярнуўся ў Полацк

**Унікальнае палотнішча — сцяг Полацкага кадэцкага корпуса ўзору 1844 года — доўгі час лічылася згубленым. Калі ж яго пачалі шукаць, высветлілася, што гістарычная рэліквія спачатку захоўвалася ў Югаславіі, Германіі, а з 1957 года — у сінадальным Знаменскім саборы Нью-Ёрка.**

На працягу апошніх гадоў грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз сувораўцаў і кадэтаў» вяло перамовы са старшынямі Нью-Ёркскага аб'яднання кадэтаў і Прэзідыумам кадэтаў замежжа па пытанні вяртання сцяга ў Полацк. У выніку 4 мая 2014 года ў горадзе Белая Царква (Сербія) беларусам перадалі аднаўленую копію палотнішча (з ушытымі фрагментамі арыгінала). Рэліквія была перададзена на часовае захоўванне ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Яшчэ тады **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Віктар ГУМІНСКІ** выказаў меркаванне, што «гістарычны сцяг Полацкага кадэцкага корпуса ўзору 1844 года павінен служыць не проста сімвалам, перад ім павінны прыносіць прысягу кадэты».

Праз год, якраз на мінулых выхадных, сцяг нарэшце вярнуўся на полацкую зямлю. Плануецца, што да моманту стварэння ў Полацкім кадэцкім вучылішчы дамавой царквы копія рэліквіі будзе захоўвацца ў Багаяўленскім саборы.

— Сцяг Полацкага кадэцкага корпуса ўнікальны. Ён мае вялікую духоўную каштоўнасць. Фактычна гэта — самы старажытны беларускі ваенны сцяг, — адзначылі ў прэс-службе Полацкага райвыканкама.

У Полацк вярнулася копія найвышэйшага сімвала гонару і мужнасці, святыні, якой пакланялася не адно пакаленне кадэтаў, перад якой прыносілі прысягу. Такім чынам, працягнецца эстафета вернасці Радзіме, воінскаму прызванню, афіцэрскаму абавязку і афіцэрскаму гонару.

— Зараз ужо з абсалютнай упэўненасцю можна казаць пра тое, што пяць гадоў таму (у 2010 годзе Прэзідэнтам быў падпісаны ўказ аб адраджэнні ў Беларусі кадэцкага руху; па ўсёй краіне ў дзевяці вучылішчах навучаецца каля 1600 чалавек, прычым кожны дзясяты з іх — выхаванец дзіцячага дома) у краіне было прынята правільнае дзяржаўнае рашэнне аб стварэнні кадэцкіх вучылішчаў. Чаму? Бо кадэты атрымліваюць не толькі якасную адукацыю, але і самаўдасканальваюцца — духоўна і інтэлектуальна. Важна, што гэтыя вучылішчы арыентаваны на патрыятычнае выхаванне моладзі, на падрыхтоўку да службы ў арміі, — падкрэсліў **выканаўца абавязкаў дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Беларусі Станіслаў ЗАСЬ**, які прыняў удзел ва ўрачыстай цырымоніі перадачы копіі старадаўняга беларускага ваеннага сцяга кадэцкаму вучылішчу.

**Надзея ПАЎЛАВА.**
*dryla@zviazda.by*

# ГРОДЗЕНСКІ «СЛЕД» НА МАНБЛАНЕ

**Яго пакінулі Павел Кулеш і Дзмітрый Крапіўка, пераадолеўшы дыстанцыю ўльтрамарафона вакол горнага масіву Манблан.**

Жаданне паспрабаваць сябе ў гэтым ужо традыцыйным спаборніцтве, якое лічыцца адным з самых складаных у свеце, выказалі каля 1700 спартсменаў з многіх краін. Праўда, не кожнаму ўдалося дабрацца да фінішу. І не толькі таму, што дыстанцыя перавышала класічныя 42 кіламетры 195 метраў і складала 103 км. «Фішка» гэтага ўльтрамарафона яшчэ і ў тым, што дыстанцыя праходзіць не па раўніннай мясцовасці, а з неаднаразовымі пад'ёмамі — да 2,5 тысячы метраў над узроўнем мора. Прычым бегчы даводзіцца і днём, і ўначы. Стартаваўшы ў Італіі, спартсмены перасяклі Швейцарыю і фінішавалі ў Францыі. Сярод самых вынослівых людзей планеты, хто з гонарам вытрымаў гэтае выпрабаванне, былі і гродзенцы. Павел Кулеш фінішаваў у чацвёртай сотні, а Дзмітрый Крапіўка — сярод 250 найлепшых.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■ Добрая навіна

# ДА АБЛОКАЎ — ПА КРЭДЫЦЕ

**Авіякампанія «Белавія» запусціла на сваім сайце анлайн-крэдытаванне. Цяпер пасажыры могуць аформіць крэдыт на авіябілеты праз інтэрнэт-сэрвіс анлайн-крэдытавання «Рознічныя банкаўскія сістэмы».**

У авіякампаніі разважалі так. З кожным годам папулярнасць палётаў расце. Беларусы ўсё часцей аддаюць перавагу менавіта авіятранспарту. І цяпер у выпадку незапланаванай вандроўкі, калі нестае грашовых сродкаў, можна здзейсніць пералёт у крэдыт, а потым за пэўны перыяд часу яго пагасіць.

Як адзначыў **намеснік генеральнага дырэктара па маркетынгу і знешнеэканамічнай дзейнасці авіякампаніі «Белавія» Ігар ЧАРГІНЕЦ**, «наша кампанія першай у турыстычным бізнесе Беларусі запусціла падобную паслугу. Мы спадзяёмся, што пасажыры ацэняць гэты сэрвіс і будуць актыўна яго выкарыстоўваць».

Опцыя «Аформіць крэдыт» будзе даступнай на білеты, якія не ўдзельнічаюць у акцыях, а таксама на ўласныя рэйсы авіякампаніі. Абавязковыя ўмовы выкарыстання анлайн-крэдытавання — час да вылету не менш за трое сутак, а таксама руская ці беларуская мова сайта. Абяцаюць, што кліентам «Белавія» спатрэбіцца 15 хвілін, каб аформіць крэдыт, а ўсе неабходныя дакументы будуць падпісаны ў кліента дома ці на працы работнікамі кампаніі, якая прапануе сэрвіс анлайн-крэдытавання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■


## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БРЕСТМАШ»

| Номер лота | Наименование имущества | Год выпуска | Инв. № | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот №2 | Универсальный вертикально сверлильный станок 2Н135 | 1983 | 1031 | 11 558 400 | 1 155 840 |
| Лот №3 | Токарно-винторезный станок 16К20 | 1983 | 1034 | 19 000 000 | 1 900 000 |
| Лот №4 | Токарно-винторезный станок 16К20 | 1983 | 1045 | 19 000 000 | 1 900 000 |
| Лот №5 | Токарно-винторезный станок 16К20ПФ | 1983 | 1046 | 23 340 800 | 2 334 080 |
| Лот №6 | Токарно-винторезный станок 16К20ПФ | 1983 | 1047 | 23 340 800 | 2 334 080 |
| Лот №7 | Горизонтально-фрезерный станок 6р82 | 1983 | 1070 | 33 552 800 | 3 355 280 |
| Лот №8 | Вертикально-сверлильный станок 2Н-125 | 1984 | 1090 | 12 702 400 | 1 270 240 |
| Лот №9 | Пресс-ножницы комбинированные НВ-522 | 1985 | 1142 | 17 716 000 | 1 771 600 |
| Лот №10 | Универсальный вертикально-сверлильный станок 2Н135 | 1986 | 1183 | 11 558 400 | 1 155 840 |
| Лот №11 | Гидравлический одностоечный пресс П6126А | 1986 | 1184 | 20 788 000 | 2 078 800 |
| Лот №12 | Машина листогибочная с поворотной балкой | 1986 | 1215 | 66 096 800 | 6 609 680 |
| Лот №14 | Станок специальный консольно-фрезерный ВМ127 | 1989 | 1319 | 50 666 400 | 5 066 640 |
| Лот №16 | Станок поперечно-строгальный М7307 | 1998 | 1635 | 11 241 600 | 1 124 160 |
| Лот №18 | Станок координатно-расточной 2А450 | 1974 | 408 | 29 405 600 | 2 940 560 |
| Лот №19 | Станок токарный 1М63 | 1976 | 616 | 34 524 000 | 3 452 400 |
| Лот №20 | Станок универсальный гравировальный 6Л463 | 1976 | 633 | 3 886 400 | 388 640 |
| Лот №21 | Станок настольно-сверлильный 2М112 | 1977 | 655 | 3 337 600 | 333 760 |
| Лот №22 | Поперечно-строгальный станок 7Е35 | 1978 | 765 | 9 060 000 | 906 000 |
| Лот №24 | Токарно-винторезный станок 16К20 | 1978 | 810 | 19 000 000 | 1 900 000 |

| | |
|---|---|
| Местонахождение объекта | г. Брест, ул. Суворова, 21В |
| Условия продажи | Без условий |
| Продавец (Балансодержатель) | ОАО «Брестмаш» |
| Организатор торгов | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 5-и рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| Условия оплаты | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| Номер р/сч для перечисления задатка | р/с 3012105618108 руб. РБ в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369, УНП 102353509 |

**Аукцион состоится 22 сентября 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325, Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**Последний день приема заявлений – 21 сентября 2015 г. до 17.00. Контактные тел.: 8 029 626 72 52; 8 0162 20 92 13.**
Перечень документов, необходимых для участия в аукционных торгах, прописан в объявлении, опубликованном в газете «Звязда» от 20.01.2015 года.


**РГА «Белая Русь» выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім старшыні Пінскай гарадской арганізацыі РГА «Белая Русь» ГЕТМАНА Віталя Канстанцінавіча, які заўчасна пайшоў з жыцця. Заслужаны аўтарытэт, павага да прафесійных і асабістых якасцяў Віталя Канстанцінавіча назаўжды застануцца крыніцай светлай памяці ў сэрцах калег і сяброў.**


Утерянный представительством Белгосстраха по Заводскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 1214640 **считать недействительным.** УНП 100122726

■ Мы — разам

# НЕ СУІСНАВАЦЬ, А СЯБРАВАЦЬ

**XI фестываль нацыянальных культур адкрыецца ў Мінску ў Дзень горада. Удзел ва ўрачыстым адкрыцці возьмуць прадстаўнікі больш як 20 нацыянальнасцей з усёй краіны. Святочны гала-канцэрт упершыню пакіне камерныя залы і выйдзе на адкрытую пляцоўку на праспекце Пераможцаў. Сам фестываль будзе цягнуцца ажно да чэрвеня наступнага года і завершыцца ў Гродне. За гэты час ва ўсіх рэгіёнах Беларусі пройдуць абласныя адборы, падчас якіх кампетэнтнае журы адзначыць найлепшыя з калектываў, што атрымаюць права на ўдзел у фінале. Першым з іх шэрагу стане фестываль «Нас з'яднала зямля Беларусі», які пройдзе ў Мёрах ужо 13 верасня.**

— Сёлета мы пайшлі на пэўныя эксперыменты з фарматам, асабліва гэта будзе заўважна на заключных мерапрыемствах у Гродне, — распавяла **галоўны спецыяліст упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Людміла ЛЕБЕДЗЬ.** — Але не адмовімся і ад традыцыйных рэчаў. Як заўсёды, у Гродне адкрыецца новы аб'ект, летась гэта быў Сквер сяброўства. Прыемна адзначыць, што колькасць нацыянальнасцей, якія прымаюць удзел у фестывалі, штогод павялічваецца. Напрыклад, у мінулым годзе мы былі прыемна здзіўленыя з'яўленнем на свяце сямейнай пары з Англіі.

— Спецыяльна для адкрыцця мы рыхтуем новую праграму, — прыадкрыў заслону тайны **рэжысёр цырымоніі, загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і святаў Беларускага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Аляксей КАМІНСКІ.** — Хочам спалучыць у ёй традыцыі ўсіх дыяспар і не забыцца на беларускія. Адкрытая прастора дасць нам вялікія магчымасці.

— Безумоўна, фестываль нацыянальных культур — самая значная падзея ў жыцці беларускіх дыяспар, — зазначыў **старшыня Кансультатыўнага савета пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей, старшыня Мінскага гарадскога армянскага культурна-асветніцкага таварыства «Айастан» Георгій ЕГІЯЗАРАН.** — Я неаднойчы наведваў суседнія краіны падчас паездак для абмену досведам і магу сказаць, што нідзе няма нічога падобнага да нашага фестывалю. Гэты форум — люстэрка дзяржаўнай палітыкі па нацыянальным пытанні. У Беларусі няма дзялення на сваіх і чужых як з боку дзяржавы, так і з боку грамадзян.

Усяго за час існавання фестывалю колькасць удзельнікаў павялічылася ў разы. Калі ў першым узялі ўдзел прадстаўнікі 11 нацыянальнасцей, то ў мінулым — ужо 36. Звычайна гэта члены нацыянальных арганізацый і аб'яднанняў, але прадставіць сваю радзіму могуць і індывідуальныя ўдзельнікі.

— Пытанне захавання нацыянальнай культуры сёння мае вялікую актуальнасць, — рэзюмавала Людміла Лебедзь. — У беларусаў усё можа пачынацца з вышыванкі ці аэраграфіі з нацыянальнымі матывамі на аўтамабілі, але магчымасць заявіць пра сябе павінна быць і ў дыяспар. Фестываль нацыянальных культур — гэта прыклад таго, што ў сённяшнім неспакойным свеце прадстаўнікі самых розных народаў могуць жыць у сяброўстве і выбудоўваць нармальныя адносіны.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Напярэдадні падзеі

# ДОМРАЧАВА ЗАПРАШАЕ Ў РАЎБІЧЫ

## Тут у суботу адбудзецца вялікае спартыўнае свята

**Падрыхтоўка да фестывалю «Гонка легенд — зоркі біятлона за мір» завяршаецца. У продажы засталося ўсяго каля пяці сотень білетаў, тым не менш арганізатары шукаюць магчымасць павялічыць колькасць месцаў для балельшчыкаў, каб як мага больш беларусаў і гасцей краіны змаглі трапіць на гэтае свята.**



Запрашэнне нашай **трохразовай алімпійскай чэмпіёнкі** прынялі пераможцы Алімпійскіх гульняў, чэмпіёны свету і ўладальнікі Вялікага хрустальнага глобуса. Сярод іх такія вядомыя імёны, як Рыка Грос, Міхаэль Грайс, Халвард Ханевалд, Ліў-Грэтэ Пуарэ. Многія вядомыя спартсмены прыедуць на турнір у ролі ганаровых гасцей, каб падтрымаць удзельнікаў спаборніцтваў.

— У суботу мы будзем назіраць унікальную падзею не толькі для Беларусі, але і для ўсяго свету, таму што падобнага нідзе і ніколі не праводзілі. Сёння ў Раўбічах мы маем добры біятлонны цэнтр, дзе створаны ўсе ўмовы для падобнага турніру, і, я думаю, гэтыя спаборніцтвы адкрыюць другое дыханне нашаму спартыўнаму комплексу. Ва ўсіх ахвотных у гэтыя выхадныя будзе магчымасць дакрануцца да легендарнага біятлона, — адзначыла **Дар'я ДОМРАЧАВА.**

Акрамя спартыўных спаборніцтваў, прадугледжана культурна-забаўляльная праграма, атракцыёны для дзяцей, кожны зможа праявіць свае снайперскія здольнасці ў пнеўматычным ціры на запасным стрэльбішчы спарткомплексу. Як адзначыла Дар'я, «галоўнае — узяць з сабой добры настрой».

Сама Домрачава ў гонцы ўдзел не прыме, бо спаборнічаць будуць толькі тыя спартсмены, хто ўжо завяршыў сваю кар'еру, аднак Даша будзе прысутнічаць на фестывалі: паўдзельнічае ў фотасесіі і раздасць аўтографы. Адзначым, што і Дар'я, і арганізатары спадзяюцца, што гэтая гонка стане штогадовай.

— Мерапрыемства яшчэ не прайшло, але мы ўжо бачым па водгуках запрошаных спартсменаў, што такога фестывалю ім не хапае, гэта дадатковая магчымасць успомніць напал, тую буру эмоцый спартыўных спаборніцтваў і лішняя нагода сустрэць сваіх апанентаў і біятлонных сяброў, — адзначыла алімпійская чэмпіёнка.

Легендарныя біятланісты правядуць на раўбіцкай трасе дзве гонкі.

— Спаборніцкая траса «Гонкі легенд» будзе нескладанай. Адна «пятля» будзе ісці ў бок запаснога стрэльбішча. Гэта робіцца для большай зручнасці гледачоў. Мы свядома пайшлі на ўкарачэнне самой дыстанцыі, каб спартсмены больш стралялі, а публіка часцей магла іх бачыць, — расказаў **галоўны трэнер зборнай Юрый АЛЬБЕРС**.

Для пераможцаў і прызёраў спаборніцтваў прадугледжаны камплекты ўзнагарод, над якімі працавалі беларускія дызайнеры.

Адзначым, што на фестываль прададзена ўжо больш за 4 тысячы квіткоў, усе атрыманыя сродкі будуць накіраваны ў дзіцячы хоспіс.

Арганізатарамі фестывалю выступаюць Беларуская федэрацыя біятлона, Міністэрства спорту і турызму, Нацыянальны алімпійскі камітэт і Прэзідэнцкі спартыўны клуб.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

■ Спорт-тайм

# БЫВАЙ, ЕЎРА-2016

**Наша футбольная зборная страціла шанцы выйсці ў фінальную частку чэмпіянату Еўропы, які пройдзе ў наступным годзе, а вось маладзёжная зборная стартавала ў сваім адборы з перамогі. Аб прыкметных спартыўных падзеях — у штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды».**

**1. Футбалісты зборнай Беларусі саступілі камандзе Украіны з лікам 1:3** і страцілі нават тэарэтычныя шанцы прабіцца ў фінал чэмпіянату Еўропы-2016. Адзіны мяч у нашай зборнай у вароты ўкраінцаў забіў Сяргей Карніленка з пенальці. Пасля гульні **галоўны трэнер беларусаў Аляксандр ХАЦКЕВІЧ** сказаў, што каманда цалкам правяліла першы тайм у плане абаронных дзеянняў і ўзяў віну за паражэнне на сябе.

*— Гэта мая памылка; магчыма, не адгадалі са спалучэннем гульцоў у апорнай зоне Сівакоў — Маеўскі. Хлопцы прайгралі падбор, у іх не атрымліваўся выхад з абароны. У перапынку перастроіліся, але гэта не дапамагло. Матч быў прайграны ў першым тайме, — адзначыў на пасляматчавай прэс-канферэнцыі настаўнік.*

У паядынку лідараў групы С іспанцы перайгралі каманду Славакіі з лікам 2:0, а зборная Люксембурга пакінула апошняе месца, адолеўшы на сваім полі каманду Македоніі 1:0.

**Становішча камандаў пасля 7 тураў:** Іспанія — 18 ачкоў, Славакія — 18, Украіна — 15, Беларусь — 4, Люксембург — 4, Македонія — 3.

Нагадаем, сёння на «Барысаў-Арэне» нашы футбалісты сустрэнуцца з камандай Люксембурга.

**2. У той жа час гульцы маладзёжнай зборнай (U-21) пераможна стартавалі ў адборачным турніры** чэмпіянату Еўропы-2017 па футболе. Яны з мінімальным лікам перайгралі аднагодак са зборнай Славакіі. У матчы вызначыўся Яраслаў Яроцкі. Сваю другую гульню ў 8-й кваліфікацыйнай групе беларуская «маладзёжка» таксама, як і першы паядынак, правядзе ў Слуцку; матч супраць каманды Турцыі адбудзецца 9 кастрычніка.

У фінальную частку маладзёжнага чэмпіянату Еўропы, які пройдзе летам 2017-га ў Польшчы, выйдуць пераможцы 9 груп. Яшчэ дзве пуцёўкі атрымаюць пераможцы стыкавых матчаў, у якіх згуляюць 4 найлепшыя каманды, што занялі другія месцы.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*


## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в дер. Напалки Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2. | **Дата, время и место проведения аукциона** | 18 сентября 2015 года в 10.00 г. Жодино, пер. Молодежный, 3 Жодинский сельисполком, кабинет №1 |
| 3. | **Продавец и его адрес** | Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3 |
| 4. | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | **Лот № 1** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881708801000093 в деревне Напалки, участок № 1; **Лот № 2 –** земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881708801000094 в деревне Напалки, участок № 2 |
| 5. | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6. | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7. | **Начальная цена продажи** | **Лот № 1** – 30 000 000 рублей **Лот № 2** – 30 000 000 рублей |
| 8. | **Условия проведения аукциона** | Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Аукцион считается состоявшимся при наличии не менее двух участников |
| 9. | **Наличие инженерной инфраструктуры** | **Лот № 1, Лот № 2 (возможность электроснабжения)** |
| 10. | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной цены земельного участка, р/с 3604627020009 в филиале №616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25«А», код 812, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион»), код платежа 04901 |
| 11. | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками** | каждый понедельник в 15.00 |
| 12. | **Окончательный срок приема заявлений** | 15 сентября 2015 года до 17.00 |
| 13. | **Контактный телефон** | 8-01775 35-449, 8-01775 37-174, 8-01775 37-189 |

**Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения, подлежат возмещению победителем аукциона.**

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя, или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).



## ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК» – управляющий по делу о банкротстве ЧУП «ФАЙВ СТАРС ПЛЮС», извещает о проведении торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего должнику.

**Торги состоятся 6 октября 2015 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Долгиновский тракт, д. 149а/1, к. 3.**

*Для участия в торгах необходимо подать до 01 октября 2015 года заявку и перечислить на расчетный счет ЧУП «ФАЙВ СТАРС ПЛЮС» р/с 3012165101017 в ОАО «БПС-СБЕРБАНК», г. Минск, код 369, УНП 100959852 сумму задатка в размере 5% от начальной цены имущества. Сумма шага аукциона по каждому лоту составляет 5% от начальной цены предмета аукциона.*

С имуществом, выставляемым на торги, можно ознакомиться по его месту нахождения: г. Борисов, ул. Строителей, 26, предварительно согласовав время с управляющим. Все имущество в рабочем состоянии.

Прием заявок и документов на участие в торгах осуществляет организатор торгов – ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК» – ежедневно по рабочим дням с 9.00 до 18.00 по адресу: 220053, г. Минск, ул. Долгиновский тракт, д. 149а/1, к. 3.

Сведения об имуществе, выставляемом на торги.

| Номер лота | Сведения об имуществе | Начальная цена, за ед. рублей без НДС | Сумма задатка |
|---|---|---|---|
| 1 | Рено Мастер (гос.№ AI 9558-7, 2010 г.в.) | 108 724 000 | 5 436 200 |
| 2 | Пежо Боксер (гос. № АН 6860-7, 2010 г.в.) | 129 267 600 | 6 463 380 |
| 3 | Рено Мастер (гос. №AI 9559-7, 2010 г.в.) | 101 052 000 | 5 052 600 |
| 4 | Автоматическая экструзионно – закалочная линия IGLO LINE 5000 (Польша) | 3 635 604 000 | 181 780 200 |
| 5 | Маркировочная машина «DOMINO» «А100» | 14 119 000 | 705 950 |
| 6 | Фризер проточного действия FROSTO 400 | 330 396 000 | 16 519 800 |
| 7 | Фризер проточного действия FROSTO 400 | 330 396 000 | 16 519 800 |
| 8 | Линия пастеризационная, предназначенная для приготовления смеси мороженного | 2 760 874 000 | 138 043 700 |

Победителем торгов является лицо, предложившее наибольшую цену.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам. Все расходы, связанные с регистрацией договора купли-продажи, оформлением перехода права собственности, несет покупатель.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

По результатам аукциона организатор торгов составляет протокол в трех экземплярах.

Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 7 рабочих дней с даты проведения торгов.

Организатор вправе отказаться от проведения торгов не менее чем за 3 дня до даты проведения торгов.

С более подробной информацией о порядке, условиях проведения торгов, предметах торгов можно ознакомиться по тел.: +37517 388 03 25.

# ЗАЧАРАВАННЕ

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.





Пасля ўрачыстага набажэнства ўдзельнікі экспедыцыі «Дарога да святыняў» пасадзілі сад малітвы.

## «Невычэрпныя крыніцы матчынай мовы»

Менавіта са Шчучыншчыны паходзіць актыўны навуковец і грамадскі дзеяч Ігнат Дамейка, пісьменніца Алаіза Пашкевіч (Цётка). Яна, дарэчы, пісала: «Па-сапраўднаму шчаслівы толькі той, хто памятае свае карані, не забывае матчыну мову. Гэта невычэрпныя крыніцы, што яднаюць народ, даюць сілу і натхненне, перадаюць нашчадкам сваю любоў да роднай зямлі...» На радзіме мудрыя словы землячкі ўзялі на ўзбраенне і кіруюцца імі як у кожным дні свайго жыцця, так і падчас правядзення свята пісьменства. Родная мова гучала паўсюль: з вялікай сцэны, кніжных шапікаў, гандлёвых радоў. Па-беларуску гаварылі як кіраўнікі, так і маленькія жыхары горада. Свята сапраўды атрымалася нацыянальным.

Віншаванні з нагоды Дня беларускага пісьменства гучалі і ад Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Яго прывітальнае слова агучыў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар БУЗОЎСКІ**. **Намеснік прэм'ер-міністра Міхаіл РУСЫ**, які таксама завітаў на ўрачыстае адкрыццё, адзначыў:

— Гэтае свята — знакавая культурная падзея, якая мае свае асаблівасці, сведчыць пра багацце гістарычнай спадчыны і духоўныя традыцыі нашага народа. Ад часоў Еўфрасінні Полацкай, Францыска Скарыны кніга заўсёды была для беларусаў крыніцай ведаў, асветы, надзейным падмуркам нацыянальнага развіцця. Менавіта на ім пры падтрымцы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі будуецца сучасная палітыка ў сферы культуры і развіцця кнігадрукавання. Толькі ў мінулым годзе ў нашай краіне выпушчана звыш 11 тысяч найменняў кніг і брашур агульным тыражом больш як 30 мільёнаў асобнікаў. Можна не толькі ўбачыць гэтыя творы, але і набыць для ўласнай бібліятэкі.

Пра тое, што беларускае кнігавыданне сапраўды на вышыні, сведчаць факты. На XII конкурсе краін СНД «Мастацтва кнігі» Беларусь атрымала 12 узнагарод — і гэта рэкорд! Акрамя таго, ужо чацвёрты год запар нам дастаецца Гран-пры прэстыжнага конкурсу. Сёлета яго ўдастоілася кніга «Беларусь замкавая». Гэта выданне, якое важыць ні многа ні мала 5 кілаграмаў, даўжыня аднаго з разваротаў складае 1,2 метра — вось такія кніжныя рэкорды.

## «І няма шляху чужога». Толькі літаратурны

Пра тое, што айчыннае кнігавыданне актыўна падтрымліваецца дзяржавай, яшчэ раз нагадала **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**:

— Заснаванне Нацыянальнай літаратурнай прэміі — гэта вялікая ўвага і клопат пра развіццё нашага грамадства. Беларуская кніга годна прадстаўляе краіну ў свеце. Але напачатку было слова. І перш чым кніга становіцца словам, яна задумваецца ў марах літаратараў, навукоўцаў. Яна адлюстроўвае не толькі гістарычнае мінулае, але і сённяшні дзень. Беларуская літаратура не толькі гучыць з вялікай сцэны, але і ў рамках праекта «Жывая класіка» выконваецца дзецьмі. А гэта значыць, што ў нашай мовы, літаратуры ёсць вялікая будучыня.

Сёлетнія лаўрэаты нацыянальнай літаратурнай прэміі абавязкова ўвойдуць у гісторыю, хаця б таму, што яны аказаліся першымі, праторылі шлях да ўзнагарод іншым майстрам прыгожага слова. Такім чынам, у намінацыі **«Проза»** перамог **Уладзімір САЛАМАХА** з кнігай «І няма шляху чужога». Ён падзяліўся сваімі думкамі пра высокае прызначэнне пісьменніка:



— Праца наша нечага вартая, калі не для сябе робіцца, а для іншага. Чым бы ты ні займаўся, кім бы ты ні быў — хлебаробам, рабочым, настаўнікам, палітыкам, прадпрымальнікам, калі ты працуеш толькі для сябе, робіш марную справу. Мая кніга называецца «І няма шляху чужога», бо ў нас на зямлі толькі адзін шлях — пошуку дабра. Для нас, пісьменнікаў, гэта азначае працаваць на чытача, абуджаць яго светлыя думкі. У кожнага чалавека ў жыцці надараюцца цяжкія і лёгкія часіны. І калі ў няпросту хвіліну чытач возьме ў рукі маю кнігу і яму стане лягчэй, гэта будзе значыць, што я працаваў недарэмна.

У намінацыі **«Паэзія»** найлепшай прызнана **Тамара ГУСАЧЭНКА-КРАСНОВА** са зборнікам «Сустрэча». Яна нарадзілася ў Бранскай вобласці, але ўжо шмат гадоў жыве ў Беларусі, праслаўляе прыгажосць нашай краіны. На яе творчым рахунку каля 20 кніг, яна лаўрэат міжнародных конкурсаў. Паэтка заўважыла:



— Асаблівасцю маёй кнігі з'яўляецца тое, што ў ёй сабрана 600 вершаў, як новых, так і выбраных. Гэта праца амаль усяго майго жыцця. У ёй вершы для сябе можа знайсці чытач, якому 4 гады і якому 104 гады. А называецца зборнік менавіта «Сустрэча», бо вершы ў ім не прыдуманы: яны народжаны ад сустрэчы з жыццём — з першым каханнем, верным сяброўствам і з першай здрадай, трагедыяй, болем. Адраджацца мне дапамагалі выдатныя працавітыя людзі — наш народ, які знаходзіцца вакол мяне, вучыць дабру, прастаце і праўдзівасці. Мэтай кнігі было раскрыць душу чалавеку ў розных яе станах. Спадзяюся, у мяне гэта атрымалася.

У намінацыі **«Драматургія»** перамагла **Наталля ГОЛУБЕВА** за цыкл сцэнарыяў для тэлеканала АНТ «Зваротны адлік». Яна адзначыла:

— Дазвольце падзякаваць за такую высокую ўзнагароду. Гэта ацэнка працы ўсяго творчага калектыву праграмы «Зваротны адлік», тэлеканала АНТ, якія робяць не проста дакументальнае кіно, але гістарычнае. Мы аднаўляем унікальнае беларускае мінулае і будзем рабіць усё, каб адкрыць новыя старонкі даўніны, каб яна стала даступнай, зразумелай гледачам, каб наша гісторыя стала больш шматграннай.



Найлепшым **публіцыстам** прызнаны **Міхаіл ШЫМАНСКІ** за кнігу «Мы гэтай памяці верныя». Ён аўтар больш як 20 кніг нарысаў і публіцыстыкі пра знакамітых людзей нашай краіны, яе мінулае і сённяшні дзень. Усхваляваны пераможца прызнаўся:



— Для мяне гэтая прэмія асабліва важная сёлета, бо мы адзначаем 70 гадоў Вялікай Перамогі. Ваеннапатрыятычная тэматыка — прыярытэтная ў маёй творчасці. Я працую ў журналістыцы без перапынку ўжо 55 гадоў. З часу маёй першай публікацыі ў раённай газеце прайшло 65 гадоў. Аднак той дзень для мяне дагэтуль важны, бо я напісаў нарыс пра свайго аднакурсніка — ветэрана вайны. З тых часоў лічу, што пісаць пра гераічнае і трагічнае — мой пачэсны абавязак.

У намінацыі **«Дзіцячая літаратура»** перамагла **Ганна СКАРЖЫНСКАЯ-САВІЦКАЯ** са зборнікам казак «Надзейка-Чарадзейка». Яна родам акурат са Шчучыншчыны — з вёскі Куцы Лес. Таму асабліва прыемна ёй было атрымліваць узнагароду з вялікай сцэны роднай мясцовасці. Пісьменніца расказала, чаму піша менавіта па-беларуску:



— У сваёй кнізе я тлумачу 50 прыказак і прымавак дзецям у казках і апавяданнях. Люблю беларускую мову, таму пішу менавіта на ёй, нашай мілагучнай, добрай мове. Планую працягваць тое, што распачала наша землячка Алаіза Пашкевіч... Тым больш гэта мова маіх бацькоў. Раздзел кнігі пад назвай «На далонях Бацькаўшчыны» я прысвяціла Шчучынскаму раёну — тым мясцінам, з якімі было звязана маё дзяцінства, куды я і цяпер з задавальненнем вяртаюся, каб адпачыць душой.

У намінацыі **«Літаратурная крытыка»** найлепшым прызнаны **Дзяніс МАРЦІНОВІЧ** са сваёй кнігай «Жанчыны Уладзіміра Караткевіча». Гэты аўтар — малады літаратурны і тэатральны крытык, кандыдат гістарычных навук. Ён распавёў пра цікавую крыніцу натхнення для свайго твора:



— Я вельмі ўдзячны журы, якое выбрала гэтую кнігу. Але хачу сказаць, што ўзнагарода належыць не толькі мне, але і Уладзіміру Караткевічу, які пражыў такое насычанае жыццё. Хачу падзякаваць таксама жанчынам, якія сталі гераінямі гэтай кнігі, і сваёй дзяўчыне — яна натхніла мяне на напісанне.

У намінацыі «Дэбют» прэмія прысуджана не была. Але, будзем спадзявацца, яскравыя маладыя зорачкі вось-вось з'явяцца на небасхіле айчыннай літаратуры, у тым ліку імкнуцца атрымаць новую прэмію...

* * *

Шмат зацікаўленых шчучынцаў і гасцей сёлетняй сталіцы беларускага пісьменства пабывалі ў нядзелю ля стэнда «Выдавецкага дома «Звязда». Цікавіліся апошнімі публікацыямі нашых выданняў, маглі пазнаёміцца і паразмаўляць з літаратарамі і журналістамі, паўдзельнічаць у аўтограф-сесіях.

— «Звязду» мы з жонкай выпісваем ужо каля трыццаці гадоў, — кажа **Уладзімір ЛЯШКЕВІЧ**. — Пэўна, дзякуючы ёй мы не толькі самі навучыліся някепска размаўляць па-беларуску ў паўсядзённым жыцці, але і прывілі любоў да роднага слова нашым дзецям. Дарэчы, яны ўжо даўно таксама чытачы найстарэйшай беларускай газеты.

**Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ** зазначыў, што гістарычныя эпохі пакінулі Прынёманскаму краю багатую духоўную спадчыну, у тым ліку ў справе кнігавыдання:




Вядомы ўрач-фітатэрапеўт Яўген Шмярко – аўтар новай кнігі парад, якая выходзіць у Выдавецкім доме «Звязда».

# СЛОВАМ



Стэнд «Звязды» карыстаўся папулярнасцю.

— Выканаўчая ўлада заўсёды падтрымлівала і будзе падтрымліваць найлепшыя ідэі, творчыя пачынанні, якія скіраваны на адраджэнне традыцый нашай духоўнай спадчыны. Упэўнены, што і надалей друкаванае слова будзе служыць дабрыні, узаемаразуменню, умацаванню чалавечых каштоўнасцей.

Разам з абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі Гродзенскі аблвыканкам праводзіць конкурс рукапісаў імя Цёткі, аказваючы лаўрэатам фінансавую падтрымку ў выданні іх твораў. Сярод пераможцаў другога конкурсу — **Уладзімір САЛАСЮК, аўтар кнігі «Тайна Бабруйскай крэпасці»**:


На вуліцах Шчучына можна было ўбачыць гасцей з мінулага.

— Гэты гісторыка-прыгодніцкі раман быццам аб'яднаў два перыяды — 1812-га і 1960-х гадоў. Амаль усе школьныя гады я жыў у Бабруйску ў ваенным гарадку і гуляў з сябрамі на бастыёнах тутэйшай крэпасці. Цікавіўся яе мінулым, вайной з Напалеонам.Тым больш што ў горадзе згадваліся гісторыі аб падземных ходах крэпасці. Выказвалася нават версія, што ў падвалах можа захоўвацца знакаміты напалеонаўскі скарб. І, зразумела, многія хлапчукі спрабавалі яго адшукаць. Усё гэта таксама ёсць у рамане, дзе цесна перапляліся гістарычныя факты, выдуманыя персанажы і рэальныя людзі. Дарэчы, імёны многіх маіх сяброў дзяцінства захаваны. Спадзяюся, кніга спадабаецца і дарослым чытачам, і падлеткам.

Сярод пераможцаў конкурсу і **аўтар кнігі «Сінія васількі» Іван ПЯШКО**:

— У кнігу ўвайшлі 40 апавяданняў для дзяцей. Тэматычна яна падзяляецца на тры раздзелы. Першы — гэта ў асноўным мае ўспаміны пра незабыўнае дзяцінства. Другі — незвычайныя гісторыі, што могуць здарыцца з маленькімі грыбнікамі. І трэці раздзел — апавяданні, якія вучаць правільным адносінам да братоў нашых меншых.

**Расійскі пісьменнік і кнігавыдавец Георгій ПРАХІН** прыехаў на свята беларускага пісьменства са сваім унукам:

— Я хацеў бы звярнуцца не столькі нават да сваіх равеснікаў, колькі да моладзі з адным пажаданнем. Беражыце сваю цудоўную, распеўную беларускую мову, якая так гарманіруе з вашай прыгожай, так бы мовіць, вельмі чалавечнай прыродай і характарам народа. Слова не толькі нешта абазначае, у прыватнасці нашы пачуцці. Яно дасягае большага — фарміруе гэтыя пачуцці. І чым багацейшая мова, тым багацейшыя і чалавечыя пачуцці. А збядненне мовы і збядненне пачуццяў адбываюцца адначасова. Таму вучыце, паважайце сваю мову, размаўляйце на ёй.

А вось **гродзенскі мастак Юрый ЯКАВЕНКА** сваё зачараванне словам, павагу да гісторыі выказвае мовай графікі. Яго ілюстрацыі паводле знакамітай «Песні пра зубра» Міколы Гусоўскага паядналіся з «літарным» жывапісам **мастака Аляксандра СІЛЬВАНОВІЧА** ў праекце «AlfAbet», частку якога можна было ўбачыць у Шчучыне.

Юрый Якавенка з задавальненнем пазнаёміўся і з іншымі праектамі, якія былі прадстаўлены ў Дзень беларускага пісьменства. У прыватнасці, яму вельмі спадабалася выстава «Памяць аб вайне нам кніга пакідае», якую падрыхтавала Нацыянальная бібліятэка Беларусі да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Экспазіцыя паказвае газеты, лістоўкі, плакаты, друкаваныя і рукапісныя кнігі, што выдаваліся ў гады вайны ў падпольных, партызанскіх друкарнях, знаёміць з іншымі «сведкамі» ваеннага часу.

Дарэчы, у Дзень пісьменства не абышлося і без тэатральнага слова. Гродзенскі абласны драматычны тэатр паказаў «Камедыю для нешчаслівага селяніна», а тэатр Астравецкага цэнтра культуры і народнай творчасці — п'есу «Калядны вечар». Яе аўтар — **галоўны рэдактар газеты «Астравецкая праўда» Ніна РЫБІК**:

— Прататыпы маіх гераінь — побач з намі. П'еса «вырасла» з маіх журналісцкіх вандровак, сустрэч са старымі людзьмі ў бальніцы сястрынскага догляду. Спачатку напісала апавяданне па праблеме адзінокай старасці, расплаты за свае, а часам і чужыя грахі, а потым з'явілася ідэя паставіць спектакль.

Увечары 6 верасня адбылося ўрачыстае закрыццё Дня беларускага пісьменства. На галоўнай сцэне адбылася цырымонія перадачы эстафеты свята. Старшыня Шчучынскага райвыканкама Сяргей Ложачнік урачыста перадаў старшыні Рагачоўскага Савета дэпутатаў Валянціне Ганковіч вымпел і пажадаў кіраўніцтву гэтага горада пачаць рыхтавацца да будучай урачыстасці ўжо заўтра.

**Барыс ПРАКОПЧЫК,**
**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА**
**і Надзеі БУЖАН.**

*Шчучынскі раён.*



У адкрытай да свята кнігарні «Несцерка» — самыя сучасныя тэхналогіі.

## Конкурс юных чытальнікаў «Жывая класіка»:

# СЁЛЕТА І НАДАЛЕЙ

Васьмігадовая Саша Ашэйчык чытала верш Артура Вольскага «Начное здарэнне». Ну, не чытала, вядома, а, паводле ўмоў конкурсу, прамаўляла на памяць са сцэны Шчучынскага раённага дома культуры. Але як прамаўляла! Уся глядзельная зала ўміг апынулася ў тым трамваі, у які ўскочыў герой твора Сон, і кожны быццам не ад Сашы пачуў эмацыйнае *«Што такое?.. Як жа гэта? Ехаў зайцам, без білета!.. Ды зрабіў такую шкоду!.. У бяду ўляцелі б з ходу!..»*, а ад вагонаважатага, «нейкага дзядзькі» і паставога, што яшчэ нядаўна ў кнізе Вольскага прамаўлялі гэтыя словы спакойна, «друкавана».



А шасцігодка Даша Дубкова? Верш Максіма Танка пра памяркоўнага Слімака-дабрака і Жука-бяздомніка, які, небарака, зусім забыўся на сваё абяцанне аддзячыць першаму, гучаў з вуснаў малечы настолькі жыва, што падалося літаральна наступнае: не проста верш, а гэта было на самай справе, і дзяўчо — таму сведка!

Адзінаццацігадовая Гражынка Вайцяховіч *(на фота)* выйшла басанож. Павольна, няўпэўнена, апусціўшы галоўку, з сумным тварыкам, трымаючы ў руцэ цацку — карычневага мішку, яна дайшла да сярэдзіны сцэны і пачала: *«У ноч з дваццаць трэцяга на дваццаць чацвёртага ліпеня тысяча дзевяцьсот сорак другога года...»* Прамовіла гэта ніякім, як ад вялікай, несусветнай стомы, голасам — і раптам літаральна крыкнула ў глядзельную залу: *«Фашысты акружылі родную вёску»*. І зноў — з адчаем і вялікай стомай, ціха, прыглушана: *«Маю вёску...»* Дзяўчынка чытала ўрывак з вядомай кожнаму беларусу кнігі «Я з вогненнай вёскі». Хоць зноў лепш сказаць — не чытала, а... пражывала. У сціплай падранай сукенчацы, з мішкам у правай руцэ. Упаў той мішка долу, ледзь толькі прамовіла яго гаспадыня самыя страшныя, самыя цяжкія словы... І ці знайшлося ў зале хаця б адно сэрца, якое не захлынулася ад гэтага эпізода?..



Шаснаццацігадовы Мікіта Забоеў чытаў «Баладу Брэсцкай крэпасці» Рыгора Барадуліна. Прасцей было б сказаць «чытаў надрыўна», але варта пашукаць больш адпаведныя азначэнні: Мікіта літаральна рваў душу, сваю і кожнага з прысутных. І трэба было так, бо... *«не прыпудрана выдумак пацярухай»*, бо *«памяць сыходзіцца ў агні»*. *«Слухай!»* — заклікаў Мікіта. Мікіту слухалі, як слухалі калісьці паведамленні Левітана.

Мяркуеце, я занадта ўзнёслая, надзвычай уражаная і раздаю тут эпітэты налева-направа? Не, я насамрэч «аб'ектыўнічаю». І не паспею (не хопіць месца) распавесці пра кожнае дзіцячае выступленне мінулай суботы на канцэрце «Жывая класіка» ў рамках Свята беларускага пісьменства ў Шчучыне. Хоць надта ж хочацца.

Нехта скажа (ці, можа, ужо сказаў), што дзіцячае бачанне твора псуецца пафасам настаўніцкага падыходу да яго сцэнічнай інтэрпрэтацыі. Дзесьці, маўляў, аўтарам укладалася зусім не тая інтанацыя, дзесьці ад гэтай зменянай інтанацыі кульгаў, маўляў, сэнс... Нехта, упэўнена, штосьці не да канца зразумеў. Нехта некаму паблажліва ўсміхнуўся. Але я аддала б шмат што за тое, каб у нас вось так чыталіся творы. Празаічныя і паэтычныя. «Як яны павывучвалі такія кавалкі тэкстаў?» — недаўмявалі некаторыя гледачы. Наіўнасць, узведзеная ў ступень павярхоўнага бачання сапраўдных дзіцячых магчымасцей.

Я заплюшчваю вочы і бачу Мікіту Лысевіча ў саламяным брылі, як прамаўляе ён: *«Даўно гэта, мае дзеткі, было. Па ўсім свеце гуло, у паветры насілася, да нас дакацілася»*. Хоць лепей сказаць — не прамаўляе, а бае. Чую дагэтуль, як узрушана Ігар Жамойда чытае прысвячэнне Караткевіча Багдановічу. Як непасрэдна Сяргей Смолік распавядае пра Карызнавы «Дзіўныя чаравікі», як «Пісьмо зайца да байкароў» Сымона Блатуна чытае Аляксей Суцько... Так, я аддала б шмат што за тое, каб у нас вось так чыталіся творы. Паэтычныя і празаічныя.

**Святлана ДЗЯНІСАВА.**

■ Нацыянальны конкурс

# АРГАНІЗАЦЫІ СА ЗНАКАМ ЯКАСЦІ

## У спіс прэтэндэнтаў на званне лаўрэата прэміі ўрада ў галіне якасці за 2015 год уключана 31 арганізацыя Беларусі

**Паводле інфармацыі Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі, сёлета наша краіна праводзіць ужо сямнаццаты конкурс гэтай прэміі. У Дзяржстандарце адзначаюць, што за гэты час падобныя «спаборніцтвы» ўжо сталі для айчынных прадпрыемстваў важным інструментам павышэння якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі і паслуг, укаранення сучасных метадаў і тэхналогій сістэмнага менеджменту, павышэння даверу спажыўцоў і распаўсюджвання перадавога вопыту.**

Сёння ў спіс такіх арганізацый трапіла больш за трыццаць прэтэндэнтаў, якія прадстаўляюць розныя галіны эканомікі. Сярод іх хапае буйных прадпрыемстваў, добра вядомых не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой. Гэта такія акцыянерныя таварыствы, як «МІЛАВІЦА» з Мінска, «Савушкін прадукт» з Брэста, мясакамбінаты з Гродна і Віцебска, «Булачна-кандытарская кампанія «Дамачай», Беларускі металургічны завод і Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод. За прэмію ўрада сёлета будуць змагацца і такія прадпрыемствы, як акцыянернае таварыства «Завод горнага воску» з гарадскога пасёлка Свіслач і ЗАТ "Аўгуст-Бел" з пасёлка Дружны (абодва — Мінская вобласць), замежнае прадпрыемства «АйБіЭй АйТі Парк» са сталіцы, Гродзенскі дзяржаўны інстытут імя Янкі Купалы і астатнія.

Эксперты Дзяржстандарта паведамляюць, што мадэль, па якой ажыццяўляецца конкурс на атрыманне ўрадавай прэміі, цяпер улічвае тэндэнцыі сучаснага менеджменту, а таксама адпавядае крытэрыям прэміі Садружнасці Незалежных Дзяржаў за дасягненні ў галіне якасці прадукцыі (паслуг) і мадэлі дасканаласці Еўрапейскага фонду якасці. Гэта дазволіць экспертам больш дэталёва ацэньваць узровень работ па якасці ў арганізацыях, а прадпрыемствам-удзельнікам грунтаваць свой падыход у галіне менеджменту якасці на прынцыпах, якія ўжываюцца нашымі замежнымі партнёрамі.

Спецыялісты камітэта паведамляюць, што сёлета найбольш вострая барацьба за званне лаўрэата ў галіне якасці чакаецца па такім напрамку дзейнасці, як вытворчасць прадукцыі тэхнічнага прызначэння. Цяпер, у межах конкурсу, ажыццяўляецца разгляд экспертамі дакументаў, пасля чаго плануецца наведванне арганізацый, дзе фактычны стан будзе ацэньвацца непасрэдна на месцы.

Арганізацыі, прызнаныя найлепшымі ў галіне якасці, будуць аб'яўлены напрыканцы года. Лаўрэатам будуць уручаны дыпломы і сімвалы прэміі, а таксама яны атрымаюць права выкарыстоўваць у маркіроўцы прадукцыі і ў рэкламных матэрыялах выявы яе эмблемы.

Звесткі аб прадпрыемствах-лаўрэатах і іх прадукцыі будуць размешчаны на сайце Дзяржстандарта (www.gosstandart.gov.by), уключаны ў штогадовы каталог, які накіроўваецца ў прадстаўніцтва Беларусі за мяжой ■

■ Інавацыі

# СТРАТЭГІЯ ЛІЧБАВАГА БАНКІНГУ

## У найбліжэйшы час фінансавыя структуры краіны плануюць запусціць адзіную банкаўскую сістэму ідэнтыфікацыі кліентаў

**Кіраўнік галоўнага ўпраўлення развіцця лічбавых банкаўскіх тэхналогій Нацыянальнага банка Беларусі Аляксандр СОТНІКАЎ паведаміў, што ў гэтым годзе рэгулятар плануе зацвердзіць стратэгію развіцця лічбавага банкінгу на бліжэйшыя пяць гадоў.**

Ён адзначыў, што яшчэ адным ключавым напрамкам работы з'яўляецца рашэнне пытанняў з міжбанкаўскай ідэнтыфікацыяй і аўтэнтыфікацыяй. Паводле яго слоў, цяпер спецыялісты Нацбанка актыўна працуюць з органамі дзяржкіравання ў частцы рэгулявання развіцця лічбавага банкінгу і міжбанкаўскай ідэнтыфікацыі.



Асобна Аляксандр Сотнікаў нагадаў, што ва ўсім свеце адбываецца імклівая лічбавая трансфармацыя як самога грамадства, так і банкаўскага сектара. У сувязі з гэтым у Беларусі лічаць развіццё лічбавых тэхналогій у гэтай сферы правільным кірункам руху, паколькі яно дазваляе мінімізаваць выдаткі для банкаўскіх структур і ў выніку знізіць кошт паслуг для спажыўцоў.

Нагадаем, што стварэнне адзінай банкаўскай сістэмы ідэнтыфікацыі кліентаў прадугледжвае ўлік даных асобы тым банкам, у якім ён прайшоў першасную ідэнтыфікацыю альбо абнавіў сваю персанальную інфармацыю. Пры звароце гэтага кліента ў іншы банк Беларусі той зможа скарыстацца адзінай сістэмай для атрымання ўсіх неабходных звестак ■

■ Арэнда жылля

# МАШТАБНАЕ ПАТАННЕННЕ НЕ СПЫНЯЕЦЦА. ПРЫНАМСІ, ПАКУЛЬ



## Павышаны попыт не з'яўляецца галоўным фактарам пры фарміраванні цэннікаў на здымныя кватэры сталіцы

**У мінулыя гады менавіта ў другой палове ліпеня, потым у жніўні і нават часткова да трэцяй дэкады верасня на мінскім рынку прыватнай арэнды назіраўся самы лепшы сезон для гаспадароў свабодных кватэр. Звычайна ў гэты час сур'ёзны попыт на жыллё з боку новых студэнтаў і свежых спецыялістаў вымушаў новых кватарантаў згаджацца з завышанымі цэннікамі. Узнікала тэндэнцыя на падаражэнне арэнды, што аўтаматычна стварала ўжо ажыятажны попыт сярод усіх бескватэрных жыхароў галоўнага мегаполіса краіны.**

### ПОПЫТ НАВАТ БОЛЬШЫ, ЧЫМ ЛЕТАСЬ

Ужо традыцыйна вынікі апошняга летняга месяца часцяком вызначаюць тое, якой будзе сітуацыя на рынку арэнды да канца года. Сёлета жнівень цікавы не толькі тым, наколькі вырас попыт пасля прыезду ў сталіцу студэнтаў. Чарговая карэкціроўка курса валют на фінансавым рынку паўплывала на тэндэнцыі развіцця другаснага рынку арэнды жылля нават мацней, чым запланаваныя сезонныя фактары.

**Эксперт рынку нерухомасці сталіцы Арцём САХАРЭВІЧ** падрыхтаваў агляд рынку арэнды кватэр у Мінску за жнівень. Паводле яго слоў, нават фінансавыя цяжкасці нашай эканомікі не могуць спыніць натуральны рост попыту на здымнае жыллё напярэдадні новага навучальнага года. У апошні час шмат было сказана пра палепшанае забеспячэнне студэнтаў інтэрнатамі, што павінна было аслабіць попыт на арэнду кватэр першакурснікаў. Аднак існуе і важны аспект, якому не надавалася належнай увагі, што звязаны з колькасцю выпускнікоў, якія закончылі сёлета ўніверсітэты ці іншыя навучальныя ўстановы і, напэўна, многія застануцца ў Мінску. Як вынік, колькасць заявак аб пошуку здымнага жылля ў жніўні была нават вышэйшая, чым летась.

Агульная прапанова свабодных кватэр скарацілася ў параўнанні з ліпенем на 3,3%. Чакана лідзіравалі па вымыванні аб'ектаў аднапакаёвыя кватэры, якіх стала за месяц на 4,2% менш. Колькасць незанятых двухпакаёвак скарацілася на 2,8%, а вось кватэр з трыма пакоямі стала больш на 1,2%. Але, нягледзячы на працяглае памяншэнне колькасці свабодных кватэр на рынку, бягучы ўзровень прапановы па-ранейшаму перавышае мінулагодні на 6%.

Спецыяліст асобна адзначае, што ў апошнія месяцы на рынку назіраецца рознанакіраваная дынаміка попыту і прапановы. У першым выпадку ідзе паступовы рост актыўнасці арандатараў, у другім — плаўнае памяншэнне прапановы. Пры такім развіцці падзей рост арэндных ставак быў толькі пытаннем часу. Менавіта ў жніўні ўсе ўдзельнікі рынку яго і чакалі.

Але ў развіццё падзей умяшалася сітуацыя на валютным рынку. Усяго за месяц курс замежнай валюты значна змяніўся, што, напэўна, астудзіла апетыты тых уласнікаў, якія разлічвалі павысіць стаўкі арэнды. Ні для кога не сакрэт, што плата за арэнду на прыватным рынку бярэцца з кліентаў звычайна ў доларах. Калі гэта валюта ў краіне істотна даражэе, то даход за арэнду ў рублях таксама павялічваецца. Гэта калі цэннік у валюце застанецца на ранейшым узроўні.

**Нягледзячы на працяглае памяншэнне колькасці свабодных кватэр на рынку, бягучы ўзровень прапановы па-ранейшаму перавышае мінулагодні на 6%.**

Аднак павышаны попыт ужо не з'яўляецца галоўным фактарам у фарміраванні цэннікаў. Кліенты проста адмаўляюцца здымаць жыллё па такім кошце і шукаюць больш танныя варыянты.

### ЁСЦЬ АДНАПАКАЁЎКІ І ЗА 250 ДОЛАРАЎ

Нагадаю, што сёлета ў Мінску ў ліпені назіралася самая моцная хваля патанення стандартнага жылля ў валютным вымярэнні. Тады самыя слабенькія па якасці аднапакаёвыя кватэры магчыма было зняць нават за 220-260 долараў у месяц. Цяпер самыя бюджэтныя кватэры ўжо адшукалі сваіх новых гаспадароў, а свежых танных аднапакаёвак усім не хапае.

У жніўні сярэдняя стаўка арэнды кватэр у сталіцы складае на аднапакаёвыя кватэры 267 долараў (рост у параўнанні з ліпенем — на 0,8%). Разам з тым патэнцыйныя кватаранты працягваюць і цяпер упарта шукаць маленькія кватэры на ліпеньскім кошце. У агенцтваў нерухомасці сёння застаецца шмат заявак на жыллё, арэндны цэннік якога зафіксаваны на ўзроўні да 250-260 долараў.

На гэтым фоне змены тэндэнцый у структуры маленькіх бюджэтных кватэр двухпакаёўкі і ў жніўні працягвалі таннець з тэмпам 1,4%. Сёння сярэдняя стаўка арэнды па такому жыллю складае 348 долараў. Аднак такі памер арэнды сёння больш адпавядае пажаданням гаспадароў жылля, чым тым, хто рэальна згодны яго здымаць. Напрыклад, мой калега на працягу жніўня неаднаразова зніжаў цэннік на сваю пустую двухпакаёўку з 360 да 320 долараў. А ў выніку ўжо ў верасні ён так і не можа здаць сваё жыллё нават за 300 долараў.

### ПАЧАЛІ НЕРВАВАЦЦА ГАСПАДАРЫ

Уся справа ў тым, што на фоне патанення арэнднай стаўкі ў сталіцы назіраецца маштабнае перасяленне кватарантаў з адных бюджэтных кватэр у другія — больш танныя жылыя памяшканні. А надалей гаспадары нанова вызваленых кватэр вымушаны прапаноўваць сваё жыллё яшчэ танней, чым сярэдняя стаўка па горадзе. Барацьба за кватарантаў у выніку ператвараецца ў нейкае нервовае спаборніцтва прапановы яшчэ таннейшых варыянтаў. У гэтым выпадку законапаслухмяныя ўласнікі свабоднага жылля, якія заключылі дагаворы на доўгатэрміновую арэнду, не абаронены ад адыходу кватарантаў ніяк.

Вызваленыя кватэры для новых кватарантаў спачатку трэба падрыхтаваць. Пэўны час патрэбны менавіта на пошук новых жыльцоў, якія пры выбары кватэры пачынаюць дыктаваць гаспадарам свае ўмовы. У выніку на рынку прыватнай арэнды пачынае набіраць абароты новы трэнд, калі ўласнікі сапраўды якаснага жылля ўвогуле здымаюць свае кватэры з каталогаў прапановы.

### ДЭФІЦЫТ ЖЫЛЛЯ ЧАКАЕЦЦА Ў ЛІСТАПАДЗЕ?

Калі пакіданне рынку якасных кватэр атрымае масавы характар, то ўжо праз месяц-другі тэндэнцыя на патанненне цалкам знікне ці наогул зменіць напрамак на павелічэнне цэннікаў. Менавіта бліжэй да першых сур'ёзных маразоў у свае кватэры пачнуць вяртацца бабулькі, якія здавалі жыллё «ў шэрую» выключна на дачны сезон. Спачатку такое жыллё прапануюць кватарантам на працяглы тэрмін, а потым патрабуюць вызваліць памяшканне на падставе змянення «сямейных абставін».

Разам з тым аналітыкі ўпэўнены, што ў бліжэйшы месяц стаўкі арэнды стандартнага жылля ў сталіцы будуць толькі зніжацца ■

■ Грошы

# ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ РЭЗЕРВЫ — 5 МЛРД 24,3 МЛН ДОЛАРАЎ

**Менавіта такі аб'ём ЗВР у эквіваленце мае наша краіна ў нацыянальным вызначэнні па стане на пачатак верасня, паведамляе прэс-служба фінансавага рэгулятара краіны.**

А вось у адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднага валютнага фонду нашы рэзервы па выніках жніўня складаюць 4 млрд 574 млн долараў у эквіваленце. Спецыялісты падлічылі, што за мінулы месяц ЗВР у нацыянальным вызначэнні скараціліся на 170,2 млн долараў. Эксперты Нацыянальнага банка краіны патлумачылі, што на зніжэнне аб'ёму золатавалютных рэзерваў сёлета ў жніўні паўплываў факт пагашэння ўрадам і Нацбанкам Беларусі знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце ў поўным аб'ёме.

Падтрымманню золатавалютных рэзерваў спрыялі паступленні ад збірання экспартных пошлін на нафтапрадукты, павелічэнне кошту золата на міжнародным рынку каштоўных металаў, а таксама паступленне сродкаў ад продажу Міністэрствам фінансаў і Нацыянальным банкам Беларусі аблігацый, якія былі намінаваны ў замежнай валюце ■

Матэрыялы паласы падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ. kurkach@zviazda.by

■ Прафесійны Алімп

# ВЫНІКІ WORLDSKILLS — СІГНАЛ ДЛЯ ІНВЕСТАРАЎ,

## або Хто найперш павінен быць зацікаўлены ў падрыхтоўцы кадраў?

**«Я не магу прыгадаць выпадку, калі б краіна, якая толькі далучылася да руху WorldSkills, адразу здзейсніла магутны рывок і трапіла на спаборніцтвах у «топ» пераможцаў», — заявіў прэзідэнт Міжнароднай некамерцыйнай асацыяцыі WorldSkills International (WSI) Сайман БАРТЛІ, калі наведваў Беларусь у маі 2014 года. Наша краіна стала членам WorldSkills у студзені 2014 года, але ўжо праз чатыры месяцы правяла першы нацыянальны чэмпіянат па рабочых прафесіях. Нядаўна беларуская каманда вярнулася з бразільскага Сан-Паўлу, дзе праходзіў чэмпіянат свету па прафесійным майстэрстве з удзелам канкурсантаў з 59 краін і экспертаў з 70 краін. Гэта беспрэцэдэнтны выпадак, калі нацыянальная каманда ўпершыню ўдзельнічае ў міжнародных спаборніцтвах такога ўзроўню і выстаўляе сваіх канкурсантаў адразу ў 15 кампетэнцыях! Пра вынікі і высновы, зробленыя пасля вяртання з Бразіліі, расказалі падчас «круглага стала» ў БЕЛТА намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК і рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Аркадзь ШКЛЯР.**



### ДЗВЕ НЕАФІЦЫЙНЫЯ ПЕРАМОГІ

— Канкурсанты, якія прыязджаюць на алімпіяду ўпершыню, звычайна займаюць апошнія месцы, а мы апынуліся ў цвёрдай сярэдзіне ва ўсіх кампетэнцыях. Больш за тое, заваявалі два медалі. Іх чамусьці называюць «медалямі выдатніка». Але на англійскай мове назва ўзнагароды гучыць як Medal of Excellence — медаль дасканаласці, або перавагі (выдавалі ўдзельнікам чэмпіянату, якія набралі 500 і больш балаў, але не былі ўзнагароджаны залатым, сярэбраным ці бронзавым медалём. — **Аўт.**) Гэта азначае, што нашы канкурсанты, якія атрымалі гэтую ўзнагароду, з'яўляюцца выдатнымі, дасканалымі спецыялістамі ў сваёй справе! — падкрэсліў Аркадзь Шкляр.

**«WorldSkills — гэта апераджальныя тэхналогіі ў падрыхтоўцы кадраў для эканомікі Беларусі».**

Сусветны чэмпіянат праводзіўся па 50 кампетэнцыях. Каманда Расійскай Федэрацыі была заяўлена ў 34, і яны ўзялі 6 медалёў выдатнікаў. Арменія была прадстаўлена ў дзвюх кампетэнцыях, Казахстан — у чатырох.

Медалі выдатнікаў — у цырульніцы Алесі Назаравай, якая набрала 516 балаў, і мадэльеркі Вольгі Закрэўскай (515 балаў) — дзяўчына з Магілёўскай вобласці перамагла ў спаборніцтве дызайнераў найлепшых еўрапейскіх школ! Ярка праявілі сябе і падапечныя сеткі «Еўраопт». Кухар Мікіта Цвяткоў у першы дзень спаборніцтваў быў самым лепшым, але на другі дзень, на жаль, у яго не ўсё атрымалася. У выніку Мікіта набраў 471 бал, чаго не хапіла для перамогі. Відаць па ўсім, Мікіту падвяла бразільская бульба...

Кандытар Марыя Кушвід з 493 баламі стала другой у Еўропе, саступіўшы толькі французам, якія ў выніку і занялі другое месца ў свеце. А Марыя стала ў свеце шостай. Першымі ў яе кампетэнцыі былі карэйцы, другімі — французы і трэцімі — японцы. Марыя абышла італьянцаў і аўстрыйцаў — прызнаных ва ўсім свеце кандытараў. Дарэчы, максімальная колькасць балаў, якую маглі набраць кандытары, — 520. А да медаля выдатніка дзяўчыне не хапіла ўсяго сямі балаў.

На думку Саймана Бартлі, Беларусь магла б прэтэндаваць яшчэ на два неафіцыйныя прызы. Напрыклад, за самы хуткі старт. Бо з улікам часу, які прайшоў з моманту, як краіна далучылася да руху, удзел у такой колькасці кампетэнцый і заваяванне двух медалёў — гэта вельмі высокі вынік.

А другі прыз — за самую прыгожую парадную форму. Беларускія хлопцы былі ў кашулях з нацыянальным арнаментам, а дзяўчаты — у яркіх чырвоных сукенках з вышыўкай... У гэтай намінацыі беларусы дакладна перамаглі!

Упершыню на гэтым форуме на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця неслі сцяг нашай краіны. А беларуская эксперт давала ўрачыстую клятву — у касцюме нацыянальнай каманды і на роднай мове.

### СТАЎКА — НА РЭСУРСНЫЯ ЦЭНТРЫ

Удзел у руху WorldSkills — не проста спаборніцтвы найлепшых маладых майстроў свету.

— Уплыў падобных конкурсаў на адукацыйную сістэму краіны заключаецца ў тым, што мы атрымліваем доступ да самых сучасных кампетэнцый, тэхналогій і абсталявання, — тлумачыць Віктар Якжык. — Цяпер мы павінны вызначыць, як гэта прымяніць. Удзел у WorldSkills абавязкова паўплывае на змяненне навучальных праграм і планаў па асобных спецыяльнасцях. Не варта забываць, што на чэмпіянат ў Бразілію накіраваліся не толькі ўдзельнікі, але таксама і эксперты. Задача апошніх была прааналізаваць тэхналогіі падрыхтоўкі спецыялістаў у той ці іншай прафесіі і экстрапаліраваць іх у нашы навучальныя планы. Акрамя таго, мы атрымалі дадатковы імпульс да працы над стварэннем рэсурсных цэнтраў. Сёння ў краіне створаны ўжо 34 рэсурсныя цэнтры. Два з іх — па машынабудаванні — наш гонар. Аналагаў ім няма ў Еўропе. Мы валодаем такой матэрыяльнай базай, што міжнародныя эксперты здзіўляюцца! Гэта канцэптуальнае рашэнне, якое ўвасаблае ў жыццё Міністэрства адукацыі.

У цэлым стаіць задача на працягу трох-чатырох гадоў стварыць яшчэ каля 20 рэсурсных цэнтраў пад розныя віды эканамічнай дзейнасці.

— Рэсурсны цэнтр — не ўзорная навучальная ўстанова, у якой навучаецца эліта, а канцэнтрацыя кадравых і матэрыяльных рэсурсаў, новых методык выкладання, — удакладняе Аркадзь Шкляр. — Навучэнцы з усіх устаноў могуць ім карыстацца. Прыклад — рэсурсны цэнтр у Жлобіне па спецыяльнасцях, звязаных з сельскагаспадарчай тэхнікай. На тыдзень — паўтара туды прыязджаюць будучыя механікі і механізатары з розных устаноў адукацыі і праходзяць навучанне на найноўшых узорах сельгасмашын.

Ужо сёння ў адукацыйныя стандарты і кваліфікацыйныя патрабаванні падрыхтоўкі спецыялістаў у нашай краіне ўключаюцца элементы сістэмы WorldSkills. Па сутнасці, гэта надбудова над існуючымі кваліфікацыямі, якая забяспечвае падрыхтоўку спецыялістаў для інавацыйных тэхналогій. Сёння далёка не ўсе беларускія прадпрыемствы могуць сфармуляваць кваліфікацыйныя патрабаванні да патрэбных ім спецыялістаў. Такім чынам, можна сказаць, што WorldSkills — гэта апераджальныя тэхналогіі ў падрыхтоўцы кадраў для эканомікі Беларусі.

Аркадзь Шкляр расказаў, што ёсць, напрыклад, такая кампетэнцыя, як фрэзерныя работы на станках з лічбавым праграмным кіраваннем. Там прымяняецца мадэляванне 5D. У Беларусі гэтая тэхналогія ўкаранёна на дадзены момант толькі на двух прадпрыемствах. І калі беларускія тэхнолагі пагледзелі на тую дэталь, якую трэба будзе вырабіць у Бразіліі, яны заявілі: на яе вытворчасць патрабуецца тыдзень. А наш удзельнік спаборніцтваў зрабіў яе за шэсць гадзін.

— Такім чынам, новыя тэхналогіі дазваляюць рэзка, у некалькі разоў павялічыць прадукцыйнасць працы, прычым па любой кампетэнцыі, — адзначыў Аркадзь Шкляр. — Ламаць сістэму прафесійнай адукацыі не трэба, але трэба яе мадэрнізаваць, зыходзячы з патрабаванняў сённяшняй эканомікі. І тое, што мы атрымалі доступ да міжнароднага досведу, дае нам магчымасць не вынаходзіць веласіпед, а адаптаваць тое, што маем, да сучасных патрабаванняў і стандартаў.

**Кандытар Марыя Кушвід стала другой у Еўропе, саступіўшы толькі французам. Беларуска абышла італьянцаў і аўстрыйцаў — прызнаных ва ўсім свеце кандытараў.**

Кампетэнцыі, якія мы сёння забяспечваем на ўзроўні прафесійнай адукацыі навучэнцаў і студэнтаў, не ахопліваюць усяго спектра, які патрабуецца сучаснай эканоміцы. Гэта асабліва заўважна ў навукаёмістых кваліфікацыях — у мехатроніцы, робататэхніцы, праграмаванні САПР, працы на станках з лічбавым праграмным кіраваннем. І справа не ў тым, што мы не ў стане падрыхтаваць гэтых спецыялістаў. Мы часта проста не ведаем, па якіх кампетэнцыях іх рыхтаваць і на якім абсталяванні. Яшчэ адзін напрамак — выкладчыцкія кадры, якія забяспечваюць прафесійную падрыхтоўку тых, хто прыйдзе заўтра ў нацыянальную эканоміку, Неабходна пераасэнсаваць іх адбор, палепшыць прафесійную дзейнасць. Гэта тычыцца як выкладчыкаў, так і майстроў вытворчага навучання.

### ВЕЛЬМІ ДАРАГОЕ ЗАДАВАЛЬНЕННЕ

У фінансаванні бразільскага чэмпіянату ўзялі ўдзел больш за 200 вядучых кампаній свету. Там прымяняліся самыя сучасныя тэхналогіі. І кампаніі бязвыплатна іх прадастаўлялі, таму што сёння праблема не ў станках і жалезе — справа ў тых людзях, якія могуць на гэтым абсталяванні працаваць і забяспечыць прадукцыйнасць працы і якасць тавару. Ад гэтага залежыць канкурэнтаздольнасць эканомікі. На WorldSkills у Сан-Паўлу прысутнічалі і сотні прадстаўнікоў сусветных кампаній, якія прыглядаліся да ўдзельнікаў, каб з вельмі прывабным матэрыяльным пакетам пераманіць найлепшых да сябе.

— Для таго, каб атрымаць ураджай, трэба ва ўгноеную зямлю кінуць зерне і добра яго паліваць. Так і ў прафесійнай адукацыі — патрэбны час і намаганні, каб атрымаць жаданы вынік. На жаль, мала якія беларускія кампаніі здольны зазіраць у заўтрашні дзень, — мусіў канстатаваць Аркадзь Шкляр. — У нацыянальнага бізнесу павінна быць разуменне канчатковых мэт WorldSkills — гэта спосаб паказаць сусветнай супольнасці, што ў нас ёсць высокакваліфікаваныя спецыялісты. Умоўна кажучы, дарагія інвестары, сардэчна запрашаем вас у Беларусь! Бо мы здольныя забяспечыць вашы інвестыцыі ў тэхналогіі і сучаснае абсталяванне ўласнымі кадрамі. Вось гэтую перспектыўную задачу руху WorldSkills, на мой погляд, і павінны зразумець кіраўнікі нашых прадпрыемстваў.

Прафадукацыя — вельмі дарагое задавальненне. Ва ўсім свеце тыя, хто аказвае падтрымку праграмам прафесійнай адукацыі, маюць пэўныя прэферэнцыі з боку дзяржавы. Беларусь — адна з нямногіх краін свету, якія фінансуюць сістэму прафесійнай адукацыі выключна з бюджэту. Пакуль уся нагрузка ляжыць на Міністэрстве адукацыі. Але мы прапрацоўваем пытанне, як выйсці на шматканальнае фінансаванне. WorldSkills павінен разварушыць нашых працадаўцаў, каб яны таксама былі зацікаўлены ў падрыхтоўцы кадраў.

Віктар Якжык паведаміў, што ўжо ў канцы кастрычніка распачнуцца рэгіянальныя спаборніцтвы новага цыкла. А 16 мая 2016 года ў Мінску, у Футбольным манежы, пройдзе другі нацыянальны чэмпіянат WorldSkills Рэспублікі Беларусь. Плануецца павялічыць колькасць кампетэнцый да 30. У яго рамках пройдуць і першыя спаборніцтвы JuniorSkills.

— У нас ёсць патэнцыял для далучэння да сусветнага руху JuniorSkills — гэта школьнікі. Праз цікавасць да спаборніцтваў, да сучаснага абсталявання іх можна зацікавіць і рабочай прафесіяй. Тут ёсць адпрацаваныя методыкі, партнёры, праграмы абмену вопытам і экспертамі, і ў гэтым — яшчэ адно дасягненне WorldSkills.

Будзем задзейнічаць усе нашы ўстановы адукацыі, у тым ліку ўстановы дадатковай адукацыі. Узяць хаця б цэнтры тэхнічнай творчасці, Рэспубліканскі цэнтр інавацыйнай тэхнічнай творчасці. Магчымасці для далучэння да новай сістэмы прафарыентацыйнай працы і папулярызацыі рабочых прафесій у нас шырокія. І гэта той імпульс, які нам даў WorldSkills, — дадаў Віктар Якжык ■

■ Добрая навіна

# План па аздараўленні перавыкананы!

**За час летніх канікул у лагерах усіх тыпаў аздаравіліся больш як 361 тысяча школьнікаў, або на 5% больш, чым планавалася.**

Паводле аператыўных даных Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні, больш як 151 тысяча дзяцей адпачывалі летам у кругласутачных лагерах і 210 тысяч хлопчыкаў і дзяўчатак наведвалі летнікі з дзённым знаходжаннем. Сёлета датацыя са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання кампенсавала ад 42,7% да 83,4% кошту дзіцячай пуцёўкі ў залежнасці ад тыпу лагера. Сярэдні кошт пуцёўкі ў летнік з кругласутачным знаходжаннем склаў 3 млн 272 тысячы рублёў.

У перыяд летняй аздараўленчай кампаніі ў краіне працавала 6 180 аздараўленчых лагераў: 1 553 з кругласутачным знаходжаннем дзяцей (у тым ліку 152 стацыянарныя) і 4 627 лагераў з дзённым знаходжаннем. Агульны аб'ём фінансавання на летняе аздараўленне дзяцей перавысіў 300 млрд рублёў. Прычым на падрыхтоўку загарадных лагераў да летняга сезона было выдаткавана 90,4 млрд рублёў.

Падлеткі ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў мелі магчымасць не проста адпачыць, але і зарабіць грошы ў 995 лагерах працы і адпачынку. Гэтым летам функцыянавала 125 лагераў працы і адпачынку з кругласутачным знаходжаннем, астатнія — з дзённым знаходжаннем. Як і летась, рашэннямі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама быў загадзя вызначаны пералік арганізацый, якія прымалі школьнікаў, і віды работ для падлеткаў з лагераў працы і адпачынку, а таксама колькасць працоўных месцаў, якія падалі сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, ЖРЭА, «Зеленбуд», лясгасы, прадпрыемствы гандлю, установы адукацыі і іншыя арганізацыі.

Падлеткі займаліся пераважна прыборкай і добраўпарадкаваннем тэрыторый, азеляненнем, пасадкай дрэў, праполкай, зборам ягад, працавалі на збожжаскладах, рамантавалі навучальныя кабінеты, школьную мэблю, спартыўны інвентар, бібліятэчны фонд, афармлялі вітрыны, выраблялі сувеніры, займаліся фасоўкай тавараў.

Памер заробку ў лагерах працы і адпачынку залежаў ад віду і аб'ёму работ і працягласці знаходжання ў летніку. Напрыклад, у Навагрудскім раёне дзесяць лагераў працы і адпачынку спецыялізаваліся на добраўпарадкаванні тэрыторыі — за сваю працу падлеткі атрымалі ў сярэднім больш як 1 мільён рублёў. У Мінску, працуючы памочнікамі выхавальнікаў у яслях і дзіцячых садках, падлеткі зарабілі па 1,2 мільёна рублёў. Самы высокі заробак быў у гандлі: займаючыся выкладкай і фасоўкай тавараў, падлеткі атрымалі за змену ў сярэднім па 2,5 мільёна рублёў. Лагерамі працы і адпачынку былі ахоплены на летніх канікулах 16,9 тысячы падлеткаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
nikalaeva@zviazda.by ■

Ігуменскі тракт
№ 33 (134)



■ З месца падзей

# У АДНОЎЛЕНЫМ ПАЛАЦЫ АДКРЫЎСЯ ЦЭНТР ТВОРЧАСЦІ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ

**На адкрыццё адноўленага палаца Друцкіх-Любецкіх у Шчучыне сабралася ледзь не паўгорада. Было відаць, што для мясцовых жыхароў гэта вельмі важная падзея. Завіталі сюды і высокія госці са сталіцы — намеснік прэм'ер-міністра Міхаіл Русы, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Бузоўскі, міністр інфармацыі Лілія Ананіч, міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў, міністр культуры Барыс Святлоў, старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў. Госці ўрачыста адкрылі палац, перарэзаўшы чырвоную стужачку на ўваходзе, чым яшчэ больш падкрэслілі яго значнасць на карце беларускіх турыстычна прывабных аб'ектаў.**



Рэстаўрацыя палаца Друцкіх-Любецкіх была распачата яшчэ 10 гадоў таму, часам яна прыпынялася, аднак за год да Дня беларускага пісьменства была прадоўжана з новым імпэтам. Усе работы ўдалося скончыць своечасова, да аднаго з галоўных нацыянальных свят. У палацы замянілі вокны, нанова перакрылі дах. Надзвычай скрупулёзна рэстаўратары падышлі да аднаўлення старой ляпніны, якая калісьці шчодра ўпрыгожвала палац. Яна і цяпер здзівіць любога наведвальніка.

Дзверы і сцены тут былі напалову абабітыя драўнінай — падчас аднаўлення яе ўдалося захаваць. Гэты каштоўны, але не надта даўгавечны матэрыял пакінулі ў яго першасным выглядзе: усю драўніну асцярожна знялі, адправілі на рэстаўрацыю, а затым вярнулі на ранейшае месца.

Спецыяльна заказалі шыкоўныя люстры, якія па стылістыцы адпавядаюць часу з'яўлення палаца — неакласіцы з элементамі барока. Цяпер у такім шыкоўным адноўленым будынку паселяцца... дзеці. А дакладней, тут пачне працаваць Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі горада Шчучына. І гэты факт не можа не цешыць як гараджан, так і **старшыню Шчучынскага райвыканкама Сяргея ЛОЖАЧНІКА:**

— Мы з'яўляемся сведкамі адметнай падзеі не толькі ў жыцці нашага горада, але і ўсёй беларускай культуры, — адкрыцця адноўленага палаца князёў Друцкіх-Любецкіх. Спадзяёмся, ён стане ў адзін шэраг з такімі значнымі аб'ектамі прынёманскага краю, як замкавыя комплексы ў Міры і Лідзе, сядзіба Агінскіх у Залессі, Аўгустоўскі канал. Варта адзначыць, што шчучынскі палац — гэта не толькі адноўлены помнік архітэктуры, але і прыклад удалай інвестыцыі ў культуру. Бо сёння мы святкуем яшчэ і наваселле: тут пад шыкоўнымі высокімі столямі неўзабаве з'явяцца юныя гаспадары — таленавітыя хлопчыкі і дзяўчаткі, а таксама іх педагогі. Ім лёсам наканавана ўдыхнуць новае жыццё ў старадаўнія муры, напоўніць шматлікія пакоі духам творчасці і натхнення... Спадзяюся, гэты палац стане сапраўдным сімвалам горада.

**Метадыст шчучынскага Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Таццяна ТРАХІМЧЫК** адзначыла, што пры аднаўленні палаца імкнуліся максімальна захаваць аўтэнтыку, аднак некаторыя новыя элементы даваліся ўвесці. Напрыклад, актавая зала з'явілася ў палацы толькі ў 1939 годзе, у прыбудове. Яе таксама аднавілі і будуць выкарыстоўваць па прызначэнні.

Дарэчы, вялізную фігуру самалёта, якая стаяла перад палацам і засланяла від на возера, вырашана было прыбраць. Яе перанеслі на ваенны аэрадром за горадам.

Палац будзе адкрыты для наведвання не толькі дзеткамі і іх бацькамі. Пры жаданні, можна заказаць экскурсію і ўбачыць унутранае аздабленне новай славутасці Гродзеншчыны. Акрамя таго, тут пастаянна будуць праходзіць розныя выставы. Напрыклад, цяпер экспануецца адначасова тры калекцыі. Партрэты князёў, копіі якіх зроблены ў Гродзенскім археалагічным музеі, застануцца тут назаўжды. Яшчэ дзве калекцыі можна будзе ўбачыць у наступныя тры месяцы — выставу рарытэтнай мэблі, а таксама фотаздымкі Беларусі часоў Першай сусветнай вайны.

Варта яшчэ раз адзначыць, што палац Друцкіх-Любецкіх стаіць блізу маляўнічага возера, таму любавацца ім з самага цэнтра горада — суцэльнае задавальненне...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. Фота Надзеі БУЖАН.**

*Шчучынскі раён*

■ Рыштаванні Бацькаўшчыны



# «МАЛЕНЬКІ ВЕРСАЛЬ»

**Палац князёў Друцкіх-Любецкіх, які на Дзень беларускага пісьменства ў Шчучыне ўрачыста быў адкрыты пасля рэстаўрацыі, называюць «маленькім Версалем». Справа ў тым, што ён вельмі падобны да палаца Малы Трыянон у сапраўдным Версалі — рэзідэнцыі французскіх каралёў. Сусветна вядомы аналаг шчучынскага палаца быў спраектаваны па загадзе Людовіка XV для яго фаварыткі маркізы дэ Пампадур і пабудаваны ў 1762-1768 гадах. Князь Ксаверый Друцкі-Любецкі знаходзіўся пэўны час у Францыі ў якасці пасла Расійскай імперыі. Вярнуўшыся на Радзіму, ён дазволіў сабе такую экстравагантнасць — спраектаваць копію аднаго з каралеўскіх уладанняў. Ёсць нават думка, што ён змог завалодаць праектам французскага палаца. У тым, што гэта не проста супадзенне, пераконваюць некаторыя агульныя падыходы да планіроўкі і абсталявання ўнутранай прасторы абодвух палацаў.**



## ПАСЯРОД НЕКАЛЬКІХ РЭЗІДЭНЦЫЙ

Нягледзячы на актыўную палітычную дзейнасць, наяўнасць некалькіх рэзідэнцый (палацаў у Станіславе, Панямуне, Чарлёне, Луніне), Шчучын быў Друцкаму-Любецкаму наймілейшы. Менавіта тут, у склепе касцёла святой Тэрэзы, ён знайшоў свой апошні спачын. Сам палац, між іншым, быў пабудаваны толькі пры ўнуку Уладзіславу, якому, мажліва, дзед пакінуў свае пажаданні.

Новага ўладальніка Шчучына, Уладзіслава Друцкага-Любецкага, на будаўніцтва палаца натхніла (як і караля Людовіка XV) таксама каханне — праўда, да жонкі. Яго абранніцай стала Марыя з роду Замойскіх. Ранейшая рэзідэнцыя ў Ляхавічах не магла задаволіць маладую сям'ю, а больш прыдатныя сядзібы, напрыклад, Станіслава ў Гродне, атрымалі ў спадчыну іншыя прадстаўнікі роду. Таму і было прынята рашэнне пабудаваць новы палац. Да гэтага часу маладыя жылі ў Вільні на Антаколі.

## УНУТРАНАЕ АЗДАБЛЕННЕ

За працу ўзяўся віленскі архітэктар Раствароўскі, з якім Уладзіслаў вучыўся ў імператарскай Акадэміі выяўленчага мастацтва ў Санкт-Пецярбургу па спецыяльнасці архітэктура і жывапіс. Унутранае аздабленне палаца ў Шчучыне было падобным да Малога Трыянона. Французскі аналаг быў спраектаваны так, каб госці як мага менш сутыкаліся з прыслугай. Такая планіроўка не да канца была вытрымана, аднак даследчыкам добра вядома, што ў велічнай пабудове Друцкіх-Любецкіх не існавала памяшканняў для прыгатавання ежы і слугі тут не жылі. Сюды дастаўляліся ўжо гатовыя стравы. Побач месціўся флігель, які захаваўся дагэтуль. Ёсць версія, што адтуль вёў падземны пераход, па якім усё неабходнае слугі насілі ў княжацкія харомы.

Цікавасць выклікае і сістэма сутарэнняў. У іх усходняй частцы можна ўбачыць рэшткі незвычайнага калодзежа. Вада з яго паступала... у верхнія памяшканні будынка.

Як сведчаць апошнія ўладальнікі, мэбля ў палацы была розных стыляў. Памяшканні ўпрыгожвалі партрэты і жывапіс, скульптура мармуровай Леды невядомага аўтара. На першым паверсе амаль усю правую частку паркавага фасада займала сталовая, сцены якой былі ўпрыгожаны партрэтамі каралёў, а ў сервантах захоўвалася фамільнае серабро і французскі фарфор. Жылыя пакоі мелі больш сучасную мэблю. Бібліятэка і архіў размяшчаліся ў асобным будынку, які знаходзіўся ў парку.

## ДБАЮЧЫ ПРА ДАБРАБЫТ ГОРАДА

«Уладальнікі палаца, князі Друцкія-Любецкія, надзвычай шмат зрабілі для самога горада, — распавядае **намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Шчучынскага райвыканкама Аляксандр АМШЭЙ.** — Пачынальнік роду Францішак Ксаверый Друцкі-Любецкі, які першым пасяліўся ў Шчучыне, істотна змяніў воблік горада. Пры яго падтрымцы былі пабудаваныя мясцовыя храмы — касцёл Святой Тэрэзы і царква святога Міхаіла Арханёла. Ён шмат зрабіў для развіцця ўнутранага рынку, заклаўшы гандлёвы двор і гандлёвы цэнтр. Можна сказаць, гэты чалавек — пачынальнік сучаснага аблічча горада».

Друцкія-Любецкія займаліся таксама лесаводствам (будынак лясніцтва захаваўся), пабудавалі млын, бровар. Дарэчы, у будынку гандлёвага флігеля сёння знаходзіцца кнігарня, а ў колішнім гасцінным доме — будынак гандлёвага комплексу «Паўлінка». Удзячныя гараджане часам узгадваюць колішніх уладальнікаў горада. Але і не ведаючы пра іх, сёння працягваюць годныя традыцыі жыцця ў горадзе, які мае даўнюю гісторыю.

## «НАЙЛЕПШЫ ПРЫКЛАД РЭСТАЎРАЦЫІ»

Перыяд вялікіх баляў, паненак у шыкоўных сукнях мінуў. За савецкім часам у палацы размясціўся Дом афіцэраў. Перад палацам размясцілі вялізную скульптуру самалёта. Не ўцалеў і парк: часткова яго высеклі, ля палаца пабудавалі пяціпавярховыя жылыя дамы.

Аднак кола гісторыі пакруцілася яшчэ раз. Настаў час аднаўлення. Спецыяльна да Дня беларускага пісьменства гэтая пярлінка Гарадзеншчыны паўстала ў абноўленым выглядзе. Некаторыя спецыялісты адзначаюць, што адноўлены палац у Шчучыне — адзін з найлепшых прыкладаў рэстаўрацыі апошняга часу. Да ўсіх аўтэнтычных дэталяў пастав іліся надзвычай ашчадна. Напрыклад, да старажытнай ляпніны, якая амаль што захавала свой першасны выгляд. Тут шчыравалі спецыялісты «Белрэстаўрацыі». Ім удалося захаваць адметнасць шчучынскага палаца. А ён, дарэчы, з'яўляецца выдатным узорам пераходнага перыяду ад барока да класіцызму. У часы яго ўзвядзення так ужо не будавалі, распаўсюджанне набываў мадэрн. Аднак гэты будынак, натхнёны далёкай Францыяй, стаў менавіта такім. Яшчэ адзін адноўлены палац. Яшчэ адна нагода выправіцца ў вандроўку па роднай Беларусі.

***Вось што пісаў пра шчучынскі палац даследчык Раман Афтаназы (гэта інфармацыя выкарыстоўвалася ў тым ліку пры аднаўленчых работах):***

*Двухпавярховая мураваная рэзідэнцыя была пабудавана ў выглядзе шырокага прамавугольніка на высокім мураваным цокалі. З агульнага аб'ёму лёгка вылучаюцца тры ўзаемазвязаныя аб'ёмы. Цэнтральны, адсунуты крыху ўсярэдзіну аб'ём быў ніжэйшы за бакавыя і ствараў на галоўным фасадзе порцік з дзвюма калонамі іянічнага ордэра. Гэтая частка фасада мела на ніжнім паверсе шырокія ўваходныя дзверы, а па баках — яшчэ шырэйшыя, амаль квадратныя вокны. Верхні паверх унутры порціка мае такія ж па шырыні, але больш нізкія вокны. Сцяна ўсярэдзіне порціка была раздзелена вертыкальна 4 пілястрамі. Дзвярныя і аконныя праёмы мелі налічнікі. Калоны падтрымлівалі бэльку, пакрытую лепкай, у цэнтральнай частцы яна завяршалася закругленай сценкай, якая прызначалася для гербавага шчыта... Спусцісты бляшаны дах быў абгароджаны балюстрадным атыкам, а масіўны карніз аздоблены прафіляванай лепкай.*

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота Надзеі БУЖАН.**

*Шчучынскі раён*

■ У стылі «этна»



# ФАРБЫ «КАМЯНІЦЫ»

## Апошні ў сезоне фэстываль на адкрытым паветры парадаваў каларытнымі строямі і добрай музыкай



**У суботу ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, што ля вёскі Азярцо Мінскага раёна, сёмы раз прайшоў міжнародны фолк-фестываль «Камяніца». Як заўжды, сярод аўтэнтычных драўляных пабудоў XIX стагоддзя імпрэза набыла незабыўную атмасферу.**




